Весці БДПУ. Серыя 2. 2020. № 4. С. 60–64

УДК 94:342.542(476)

# КУПЕЦТВА БЕЛАРУСІ ЯК КРЫНІЦА ФАРМІРАВАННЯ МЯСЦОВАЙ БУРЖУАЗІІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX ст.)

**В. А. Карпіевіч,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гуманітарных навук Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Беларусі*

Паступіў у рэдакцыю 01.07.20.

UDC 94:342.542(476)

# MERCHANT CLASS OF BELARUS AS A SOURCE OF FORMING LOCAL BOURGEOISIE (THE SECOND HALF OF THE 19TH CENTURY)

**V. Karpiyevich,**
*PhD in History, Associate Professor of the Department of Humanitarian Sciences, University of Civil Protection of MES of Belarus*

Received on 01.07.20.

У артыкуле разглядаюцца пытанні, якія тычацца ўкладу купецтва беларускіх губерняў у фарміраванне мясцовай буржуазіі ў другой палове XIX ст. Вызначаецца, што купецтва было ў гэты перыяд найважнейшай сацыяльнай базай фарміравання новага класу. Паказаны асноўныя шляхі і спосабы накаплення купцамі капіталаў. Аналізуецца іх гандлёвая і прамысловая дзейнасць, удзел у стварэнні фінансавых устаноў.

*Ключевые слова:* буржуазія, купцы, капіталы, гандаль, прамысловасць, сфера паслуг, банкі, банкірскія канторы, Беларусь.

The article considers the issues concerning the contribution of merchant class of Belarusian provinces to forming the local bourgeoisie in the second half of the 19th century. It is defined that merchant class in that period was the most important social base for forming of a new class. The article shows the main ways of saving capitals by merchants. It analyzes their trading and industrial activity, participation in creating financial establishments.

*Keywords:* bourgeoisie, merchants, capitals, trade, industry, sphere of service, banks. bank offices, Belarus.

*Уводзіны.* Даследуючы праблему фарміравання буржуазіі ў Беларусі на працягу XIX ст., з’яўляецца важным раскрыць ролю тых сацыяльных груп грамадства, якія сталі ядром новага класу. Менавіта купецтва, назапашваючы значныя капіталы, амаль па ўсюды стварала ўмовы для ўзнікнення буржуазіі. Купецтва ў значнай ступені было даволі мабільнай групай у сферы прадпрымальніцкай дзейнасці. Гандлюючы, яно назапашвала сродкі, якія затым магло накіроўваць на стварэнне як дробных, так і буйных прамысловых прадпрыемстваў. Купецтва ўкладвала грошы ў развіццё транспартнай камунікацыі, садзейнічала паляпшэнню шляхоў зносін. Маючы свабодныя капіталы, купецтва само пачало даваць іх у пазыку, ствараючы крэдытна-фінансавыя ўстановы – ад банкірскіх дамоў да банкаў.

Праблемы дзейнасці купецтва Беларусі знайшлі адлюстраванне ў айчыннай гістарыяграфіі. Найбольш грунтоўна гэта тэма даследавана ў працах Н. І. Палятаевай, а таксама ў даследаваннях М. Ф. Болбаса, А. Г. Каханоўскага, З. В. Шыбекі, А. Л. Кіштымава і інш. Некаторыя беларускія гісторыкі даследавалі нацыянальны склад купецтва і іх удзел у дабрачыннай справе (Э. Р. Іофэ, Ю. В. Функ, С. Ф. Шымуковіч, В. А. Кульпановіч і інш.). Мэта даследавання: прааналізаваць дзейнасць купецтва Беларусі як адной з крыніц фарміравання мясцовай буржуазіі.

*Асноўная частка.* Купецтва Беларусі было арганізавана ў гільдыі і карысталася асобымі саслоўнымі прывілеямі, якія дазвалялі ім прымаць удзел у гарадскім самакіраванні. Згодна «Дополнительного постановления об устройстве гильдий и о торговле прочих состояний» ад 14 лістапада 1824 г., купецтва падзялялася на 3 гільдыі, кожная з якіх карысталася пэўнымі правамі і абавязкамі. Па патэнтнай сістэме 1839 г. усе купцы павінны былі мець наяўны капітал у залежнасці ад таго, да якой гільдыі яны адносіліся. Так, купцы першай гільдыі павінны былі мець наяўны капітал у памеры 15 тыс. руб. серабром, другой – 6 тыс. руб., трэцяй – 2400 руб. Самай жа шматлікай гільдыяй была трэцяя. Вельмі часта ў яе запісваліся прадстаўнікі іншых саслоўяў, каб атрымаць пэўныя прывілеі, і ў першую чаргу, каб пазбегнуць рэкруцкай павіннасці. Па падліках М. Ф. Болбаса, у 1861 г. у Беларусі было 548 гільдзейскіх купцоў. З іх 94 % адносілася да трэцяй гільдыі, 4 % – да другой, і толькі 2 % – да першай [1, с. 30].

З мэтай узмацнення купецкага саслоўя ўрад правёў у 1863 г. гільдзейскую рэформу. Згодна з новым палажэннем скасоўвалася трэцяя гільдыя. Нанава вызначаліся правы і абавязкі гільдзейскіх купцоў. Аднак праз два гады ўзнікла неабходнасць унесці папраўкі, тлумачэнні і дапаўненні да гэтага палажэння. У п. 13

закона ад 9 лютага 1865 г. адзначалася, што купецкія пасведчанні ўстанаўліваюцца двух разрадаў – першай гільдыі для аптовага гандлю і другой для рознічнага [2, отдел I, с. 159]. За купецкае пасведчанне першай гільдыі збіраецца ўсюды адна і тая ж пошліна. У той жа час гэтае пасведчанне давала права займацца аптовым гандлем рускім і замежным таварам па ўсёй імперыі, а таксама займацца ў тых месцах, дзе яны набылі пасведчанні, рознічным гандлем і трымаць там прамысловыя прадпрыемствы. Яны мелі таксама права паўсюль без абмежавання сумы прымаць падрады, пастаўкі і водкупы [2, отдел I, с. 162]. За астатнія пасведчанні плата бралася згодна класу тэрыторыі.

У выніку праведзенай рэформы ў Беларусі назіралася памяншэнне купецкага саслоўя. Асабліва гэта адбываецца пасля 1874 г., калі было адменена вызваленне гільдзейскіх купцоў ад ваеннай службы [3, отдел I, с. 2]. Таму частка купцоў парывае са сваім саслоўем і пераходзіць у мяшчанства, што таксама дае ім права займацца гандлем, не плацячы за гільдзейскія патэнты. Як сведчаць даныя табліцы 1, рост колькасці гарадскога купецтва за гэты перыяд быў значна меншы за рост гарадскога насельніцтва (за выключэннем Гродзенскай губерні). Іх доля ў складзе гарадскога насельніцтва паменшылася. Такое значнае скарачэнне купецкага саслоўя можна растлумачыць і тым, што асноўную масу, прыкладна $^3/_4$, беларускага купецтва складалі яўрэі, якія мелі вялікія сем'і, у сярэднім 8–10 чалавек. А ў купецтва запісваліся ўсе члены сямейства.

У канцы XIX ст. адбываўся рост купецкага саслоўя (за выключэннем беларускіх паветаў Віцебскай губерні і Магілёўскай губерні). Па Беларусі лік купецкага саслоўя адпаведна перапісу 1897 г. адносна 1875 г. узрос прыкладна на $^1/_3$ (132,4 %) (табліца 2).

У той жа час у паслярэформенны перыяд назіраецца рост т. з. «калектыўных» купцоў першай гільдыі. Уладальнікі гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў куплялі пасведчанні на сваё прадпрыемства альбо на створаныя імі таварыствы.

***Табліца 1*** **– Рост купецкага саслоўя гарадоў Беларусі (тыс. чалавек)**
**[4, л. 153зв.-154зв.; 5, Л. 11, 61, 79, 221; 6, с. 121–125; 7, с. 2; 8, с. 2; 9, с. 2; 10, с. 2; 11, с. 2]**

| Губерні | 1866 г. | | | 1897 г. | | | 1897 г. у % да 1866 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | насельніцтва гарадоў | купецтва | % купцоў | насельніцтва гарадоў | купецтва | % купцоў | Гарадскога | купецтва |
| Віленская | 19,7 | 0,2 | 1,0 | 34,2 | 0,3 | 0,9 | 173,6 | 150 |
| Віцебская | 54,6 | 1,6 | 2,9 | 104,4 | 2,0 | 1,9 | 191,2 | 125 |
| Гродзенская | 70,6 | 0,5 | 0,7 | 137,7 | 1,6 | 1,2 | 195,0 | 320 |
| Магілёўская | 99,5 | 2,2 | 2,2 | 147,3 | 2,4 | 1,6 | 148,0 | 109 |
| Мінская | 105,5 | 2,0 | 1,9 | 224,9 | 2,7 | 1,2 | 213,0 | 135 |
| Усяго | 349,9 | 6,6 | 1,9 | 648,5 | 8,9 | 1,4 | 185,3 | 135 |

***Табліца 2*** **– Купецкае насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX ст.**
**[12, л. 22; 13, л. 134-506; 14, л. 16-22; 15, л. 46-51; 16, с. 47; 7, с. 2; 8, с. 2; 9, с. 2; 10, с. 2; 11, с. 2]**

| Губерні | 1875 г. | 1897 г. | 1897 г. у % да 1875 г. |
|---|---|---|---|
| Віленская | 362 | 679 | 187,5 |
| Віцебская | 2169 | 2249 | 103,6 |
| Гродзенская | 1049 | 1848 | 176,2 |
| Магілёўская | 2714 | 3496 | 128,8 |
| Мінская | 2610 | 3519 | 134,8 |
| Усяго | 8904 | 11791 | 132,4 |

Як адзначала беларуская даследчыца Н. І. Палятаева, у асноўным купецтва на беларускіх землях папаўнялася за кошт мяшчанства. У 70-я гг. XIX ст. мяшчане складалі больш за палову ад агульнай колькасці мясцовага купецтва, а ў пачатку XX ст. іх колькасць стала складаць амаль тры чвэрці. На другім месцы былі выхадцы з самога купецкага асяродку, калі яны пачыналі весці ўласную справу. У 70-я гг. XIX ст. яны складалі амаль 40 % новых купцоў, але да пачатку XX ст. колькасць выхадцаў з купецкага асяроддзя сярод купцоў панізілася і стала складаць толькі чвэрць [17, с. 55, 56].

Асноўнай крыніцай накаплення капіталаў для купцоў была гандлёвая дзейнасць. Аднак у другой палове XIX ст. гандаль у Беларусі быў дробным, сведчаннем гэтаму з'яўляюцца даныя аб выдачы гандлёвых пасведчанняў і білетаў. Яскравым пацвярджэннем служаць звесткі з табліцы 3. Так, доля пасведчанняў першай гільдыі адносна агульнага ліку гадавых дакументаў на гандаль вагалася ў другой пало-

ве 1860-х гг. ад 0,1 % у беларускіх паветах Віцебскай губерні да 0,3 % у Магілёўскай, а ў беларускіх паветах Віленскай губерні яны наогул не выкупляліся. І толькі ў канцы XIX ст. доля пасведчанняў першай гільдыі складала ад 0,2 % у Віленскай губерні да 0,6 % у Магілёўскай. Нязначнай была і доля пасведчанняў другой гільдыі. Так, у другой палове 1860-х гг. яна складала ў сярэднім 5,4 % (самая нізкая доля была ў беларускіх паветах Віленскай губерні – 1,7 %, а высокая – у Магілёўскай – 8,6 %), а ў канцы стагоддзя – 7,3 % (ад 6,9 % у Віленскай да 8,2 % у Віцебскай губернях). Адной з прычын, хоць і нязначнага, росту гільдзейскага купецтва ў канцы стагоддзя стала тое, што купцам-яўрэям першай гільдыі дазвалялася ездзіць па справах у буйныя гарады імперыі, у тым ліку і ў сталіцы. Астатнім яўрэям не было магчымасці без спецыяльнага дазволу перасякаць мяжу аселасці.

***Табліца 3*** **– Лік гандлёвых дакументаў, выдадзеных у Беларусі [18, с. 135]**

| Від дакумента | | 1865–1869 гг. | | 1885–1889 гг. | | 1895–1898 гг. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лік | % | лік | % | лік | % |
| Пасведчанні | Першай гільдыі | 67 | 0,2 | 84 | 0,2 | 237 | 0,5 |
| | Другой гільдыі | 1684 | 5,4 | 2575 | 6,6 | 3684 | 7,3 |
| | На дробны гандаль | 5606 | 17,9 | 14709 | 37,6 | 16170 | 32,2 |
| | Іншыя | 15999 | 50,9 | 8314 | 21,3 | 10462 | 20,8 |
| Білеты | Першай гільдыі | 107 | 0,3 | 221 | 0,6 | 464 | 0,9 |
| | Другой гільдыі | 1183 | 3,8 | 3415 | 8,8 | 4998 | 9,9 |
| | На дробны гандаль | 6769 | 21,5 | 9769 | 24,9 | 14272 | 28,4 |
| *Усяго* | | *31315* | *100* | *39187* | *100* | *50251* | *100* |

Значную частку складалі пасведчанні на дробны гандаль, якія дазвалялі гандляваць без гільдзейскага патэнту. Іх доля ў другой палове 1860-х гг. складала ў сярэднім па Беларусі 17,9 %, а ў канцы стагоддзя вырасла да 32,2 %. Аднак асноўную частку ўсіх гандлёвых дакументаў у другой палове 1860-х гг., 50,9 %, складалі іншыя пасведчанні: на разносны і развазны торг, на мяшчанскія промыслы, прыказчыкам. І толькі ў канцы XIX ст. доля такіх пасведчанняў знізілася да 20,8 %. За гэты перыяд з 25,6 да 39,2 % узрасла доля білетаў на гандаль. Пры гэтым у другой палове 1860-х гг. доля білетаў першай гільдыі складала 0,3 %, другой – 3,8 %, на дробны гандаль – 21,5 %; у канцы стагоддзя адпаведна ўзрасла да 0,9 %, 9,9 % і 28,4 % (гл. табліцу 3).

Калі прааналізаваць цалкам даныя табліцы 3, то можна адзначыць, што доля гільдзейскіх дакументаў (пасведчанняў і білетаў) была нязначнай і складала ў другой палове 1860-х гг. каля 10 %. Пачынаючы з сярэдзіны 1870-х гг. і да канца стагоддзя іх адносная колькасць складала каля 20 %. У той жа час колькасць дакументаў, выдадзеных на дробны гандаль, значна ўзрасла. Калі ў другой палове 1860-х гг. яна складала каля 1/3, то ў 1870–1880-х гг. іх адносны лік быў крыху большы за палову, а ў канцы стагоддзя – 2/3 ад усіх дакументаў.

У цэлым неабходна адзначыць, што крыніцы накаплення купецкіх капіталаў і сферы іх прымянення былі ў Беларусі разнастайнымі. Адной з найважнейшых крыніц быў неэквівалентны абмен, звязаны з ваганнем цэн на працягу года. Асабліва гэта ярка выражалася ў неўраджайныя гады, калі цэны на прадукты харчавання, і ў першую чаргу на хлеб, значна ўзрасталі. Таму ваганне рознічных цэн залежала, галоўным чынам, ад ураджаяў. У той жа час аптовыя цэны залежалі ад цаны на замежных рынках Кёнігсберга, Мемяля, Данцыга. Пад час распаўсюджання чутак аб неўраджаях гандляры-манапалісты ігралі на гэтым. З снежня па люты цэны на хлеб амаль не мяняліся. З надыходам разводдзя яны рэзка ўзрасталі. Пры гэтым неабходна адзначыць, што стан дарог таксама аказваў уплыў на цану хлеба. У тых губернях, якія знаходзіліся бліжэй да партоў, цэны на хлеб былі значна вышэй за цэны ў глыбінках (гл. табліцу 3).

Купцы Беларусі выкарыстоўвалі і выгаднае геаграфічнае становішча беларускіх зямель, іх блізкасць да замежжа. Яны актыўна прымалі ўдзел у замежным гандлі, аднак у сваёй масе яны былі ў асноўным прадстаўнікамі буйных замежных гандлёвых кантор, якія займаліся закупам у Беларусі лесу, хлеба, ільну і іншай сыравіны. Пры гэтым яны не былі зацікаўлены ў развіцці мясцовай прамысловасці, паколькі больш выгадным было вывозіць за мяжу сыравіну, чым перапрацаваныя вырабы. У справаздачах губернатараў неаднаразова адзначалася, што дробныя гандляры скуплялі хлеб, лес і іншыя тавары і перапрадавалі іх буйным гандлярам, а тыя – часта за мяжу.

Даследчык А. П. Субоцін, характарызуючы гандаль у Мінску ў сярэдзіне 80-х гг. XIX ст., адзначаў, што гандлёвыя прадпрыемствы растуць тут значна хутчэй і канкурэнцыя абвастраецца. Асабліва канкурэнцыя ўзмацняецца паміж гандлярамі-яўрэямі: тавары, якія прадаваліся раней у 1–2 крамах, цяпер можна набыць у 10–20 лаўках [19, с. 13]. Такое можна

было назіраць і ў іншых мясцінах беларускіх губерняў. З гэтай нагоды гандлёвы абарот становіцца ўсё больш дробным.

У Мінску і іншых буйных гарадах Беларусі была высокая шчыльнасць гандлёвых устаноў. На 3000 хат у Мінску прыходзілася 2000 гандлёвых кропак альбо 1 на 30–35 чалавек. У той жа час у губернскіх гарадах Расіі іх прыходзілася 1 на 100–200 жыхароў [19, с. 13].

Другой крыніцай папаўнення сваіх капіталаў для купцоў стала мануфактурная і фабрычна-заводская дзейнасць. Калі ў сярэдзіне XIX ст. доля купцоў у мануфактурнай вытворчасці была не значная, то ў канцы стагоддзя роля і значэнне купцоў у прамысловай галіне значна ўзрастае. Па падліках М. Ф. Болбаса, у 60-я гг. XIX ст. купцы складалі толькі 16 % ад агульнай колькасці ўладальнікаў мануфактурных прадпрыемстваў. Аднак да 1900 г. іх лік узрос да 30 % [20, с. 118, 119]. Найбольшае распаўсюджванне купецкія прадпрыемствы атрымалі ў дрэваапрацоўчай, тэкстыльнай, гарбарнай, харчасмакавай галінах. К канцу XIX ст. купецкія капіталы актыўна сталі пранікаць у піваварныя і тытунёвыя прадпрыемствы. А ўжо на мяжы стагоддзяў купцы актыўна ўключыліся ў працэс стварэння акцыянерных таварыстваў.

Акрамя прамысловай дзейнасці, купецтва актыўна пранікала ў сферы паслуг. Купцы актыўна бралі ў казны падрады на будаўніцтва і дарожныя работы, на забеспячэнне камунальных паслуг. Добры даход давала і пастаўка харчавання на патрэбы арміі. Так, у 1889 г. радашковіцкі купец 2 гільдыі Й. Шапіра атрымаў падрад на пастаўку харчоў для ніжніх чыноў 23-га рэзервовага пяхотнага батальёна. На 90 чалавек казной штомесяц выдзялялася на ўтрыманне 131,49 рублёў [21, л. 17]. На ўтрыманне 119-га Каломенскага палка ў месяц выдзялялася 2268,5 рублёў [21, л. 19]. І гэта былі не адзінкавыя выпадкі, калі мясцовыя купцы і мяшчане зараблялі на пастаўках харчу і матэрыялаў расквартэраваным войскам, якіх, дарэчы, было шмат размешчана на беларускіх землях.

Немалаважную частку даходаў купцы атрымлівалі ад здачы ў арэнду жылых памяшканняў, таксама памяшканняў для магазінаў, пад склады, кінатэатры і іншыя ўстановы культуры, для патрэб дзяржаўных і камерцыйных устаноў. Таксама стваралі ўстановы грамадскага харчавання. У канцы XIX – пачатку XX ст., напрыклад, у Мінску багатымі купцамі і прамыслоўцамі было пабудавана шмат даходных дамоў. Захаваліся прозвішчы іх уладальнікаў – Абрампольскі, Броня, Гайдукевіч, Рубенчыкаў, Ляўкоў, Браўдэ, Ашкіназі, Аксельрод, Бацвіннік, Ліўшыц, Нусбейн, Рабіновіч, Маскалік, Поляк і інш. Многія з гэтых дамоў здаваліся альбо ў наём жыхарам, альбо тут размяшчаліся гандлёвыя і культурна-забаўляльныя ўстановы. Некаторыя з будынкаў здаваліся ў арэнду нават дзяржаўным і грамадскім установам. Наогул, такія дамы прыносілі сваім уладальнікам добры прыбытак, паколькі ў многіх гарадах існаваў попыт на арэндныя памяшканні.

Яшчэ адной з найважнейшых сфер дзейнасці купецтва ў Беларусі ў другой палове XIX ст. стала фінансавая. Найбольш заможныя беларускія купцы, якія мелі значныя капіталы, накіравалі свае позіркі ў банкаўскую справу. Тым больш, што з пачатку 70-х гг. XIX ст. на беларускіх землях сталі адкрывацца банкі. У 1873 г. быў заснаваны Мінскі камерцыйны банк, сярод заснавальнікаў якога былі і купцы – мінскія першай гільдыі З. Я. Гурвіч, Х. Г. Лур'е, В. З. Рапапорт, пінскія другой гільдыі С. А. Лур'е і Е. А. Эліазберг, браты І. і С. Лур'е, рыжскі купец першай гільдыі Л. Ф. Нейшэллер [22, л. 4]. Відавочна, што дзейнасць Мінскага камерцыйнага банка ў канцы XIX ст. была даволі эфектыўнай, аб чым сведчыць кошт яго акцый на фінансавых біржах. Так, у 1894 г. сярэдняя цана адной акцыі складала 250 рублёў, у 1895 – 300, а ў 1899 – 325 [23, отдел I, с. 72; отдел IV, с. 61].

Акрамя банкаў, гільдзейскія купцы адкрывалі і банкірскія канторы. Так, мінскі купец першай гільдыі Х. Г. Лур'е стварыў уласную банкірскую кантору. Купцы першай гільдыі М. Я. Поляк і Е. Б. Вейсбрэм валодалі адной з найбуйнейшых банкірскіх кантор на беларускіх землях. Абароты яе складалі ў 1889 г. 9 млн рублёў. Не менш вядомай была і Мінская банкірская кантора купчыхі першай гільдыі З. С. Браўдэ. Браты І. і С. Лур'е трымалі буйную банкірскую кантору ў Пінску, якая мела свае філіялы ў іншых частках імперыі. У Магілёве дзейнічалі банкірскія канторы І. Цукермана, Д. Ш. Ратнера, І. І. Гінзбурга і інш.

Дзейнасць банкірскіх кантор у канцы XIX ст. была даволі паспяховай, паколькі грашовыя сродкі былі запатрабаваны. Так, у 1895 г. у Мінску і павеце існавала 8 устаноў такога тыпу, іх абарот складаў 24,5 млн рублёў, а прыбытак – 49 тыс. рублёў [21, л. 20].

У канцы XIX ст. у Віцебску з'явіліся банкірскія канторы М. Л. Гінзбурга, І. А. Гінзбурга, І. Вішняка, З. Ш. Салаўя і інш. [24, л. 3].

У Гродзенскай губерні дзейнічалі фінансавыя ўстановы, якія належалі купцам М. М. Эльяшаву, Д. Х. і С. Х. Ландау, А. Ю. Вейсбергу, Н. Д. Флятэ, М. Ш. Франку, С. Л. Глікштэйну, Н. І. Вайнштэйну і інш. [25, с. 196].

*Заключэнне.* Купецтва беларускіх зямель у другой палове XIX ст. было разнастайным і неаднародным. Як і па ўсёй Расійскай імперыі, яно было арганізавана ў гільдыі. Аднак слабасць капіталаў і неразвітасць прамысловасці ў беларускіх губернях не давала магчымасці ўзнікненню тут буйных прадпрыемстваў, якія належалі б купцам. Сведчаннем гэтаму з'яўляецца тое, што колькасць купцоў першай гільдыі была нязначнай. У асноўным купцы займаліся гандлем, прычым к канцу стагоддзя значная іх частка становяцца прадстаўнікамі

буйных гандлёвых дамоў імперыі. Акрамя гандлю, мясцовыя купцы ўкладвалі свае капіталы ў стварэнне прамысловых прадпрыемстваў, фінансавых устаноў, а таксама займаліся падрадамі і здавалі памяшканні ў арэнду.

Нягледзячы на пэўную абмежаванасць і нязначныя магчымасці мясцовага купецтва, тым не менш, менавіта яны былі адной з галоўных крыніц фарміравання буржуазіі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.


### Літаратура

1. *Болбас, М. Ф.* Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861 гг.) / М. Ф. Болбас. – Минск : Наука и техника, 1966. – 268 с.
2. Полное собрание законов Российской Империи. Собр. 2. – Т. 40. – Отд. 1. 1865, от № 41642 – 42509. – СПб. : Тип. 2 отде-ния е.и.в. Канцелярии, 1867. – 993 с.
3. ПСЗРИ. Собр. 2. – Т.49. – Отд. 1. 1874, от № 52982 – 53684. – СПб.: Тип. 2 отде-ния е.и.в. Канцелярии, 1876. – [2], 948 с.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 974.
5. НГАБ. – Ф. 2502. Воп. 1. Спр. 108.
6. Памятная книжка Виленского генерал-губернатора на 1868 г. – СПб., 1868. – 499 с.
7. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н. А. Тройницкого. Т. IV. Виленская губерния. – СПб. : Изд. Цент. стат. ком-та Мин. вн. дел, 1904. Тетрадь 3. – XI, 179 с.
8. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н. А. Тройницкого. Т. V. Витебская губерния. – СПб. : Изд. Цент. стат. ком-та Мин. вн. дел, 1903. Тетрадь 3. – XIV, 281 с.
9. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н. А. Тройницкого. Т. XI. Гродненская губерния. – СПб. : Изд. Цент. стат. ком-та Мин. вн. дел, 1904. – XV, 319 с.
10. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н. А. Тройницкого. Т. XXII. Минская губерния. – СПб. : Изд. Цент. стат. ком-та Мин. вн. дел. СПб., 1904. – XVI, 243 с.
11. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н. А. Тройницкого. Т. XXIII. Могилевская губерния. – СПб. : Изд. Цент. стат. ком-та Мин. вн. дел. СПб., 1903. – XVI, 275 с.
12. НГАБ. – Ф. 2187. Воп. 1. Спр. 32.
13. НГАБ. – Ф. 2502. Воп. 1. Спр. 244.
14. НГАБ. – Ф. 2502. Воп. 1. Спр. 393.
15. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 14. Воп. 1. Спр. 655.
16. Приложение к всеподданейшему отчету Минского губернатора за 1875 г. – Минск, 1876. – 160 с.
17. *Полетаева, Н. И.* Купечество Беларуси 60-е гг. XIX – начало XX в. / Н. И. Полетаева. – Минск : БГЭУ, 2004. – 247 с.
18. *Карпіевіч, В. А.* Развіццё гандлю ў Беларусі (1861–1900) : дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / В. А. Карпіевіч ; Беларус. дзярж. пед. ун-т. – Мінск, 2003. – 138 с.
19. *Субботин, А. П.* В черте еврейской оседлости / А. П. Субботин. – СПб. : Изд. ред. Экономического ж-ла, 1888. – Вып. 1. – Минск, Вильна, Ковна и их районы. – 148 с.
20. *Болбас, М. Ф.* Промышленность Белоруссии. 1860– 900 / М. Ф. Болбас. – Минск : Изд-во БГУ, 1978. – 312 с.
21. НГАБ. – Ф. 358. Воп. 1. Спр. 16.
22. НГАБ. – Ф. 124. Воп. 1. Спр. 290.
23. Статистика краткосрочного кредита. Операции акционерных банков коммерческого кредита в 1894–1900 гг. / под ред. А. К. Голубева. – СПб. : Тип. В. Киршбаума, 1905. – 435 с.
24. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 7. Спр. 4231.
25. *Баюра, А. Н.* Развитие кредитно-банковских учреждений губернского города Гродно в конце XIX – начале XX вв. / А. Н. Баюра // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі / рэдкал.: А. І. Антоненка [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2008. – С. 193–198.

### References

1. *Bolbas, M. F.* Razvitie promyshlennosti v Belorussii (1795–1861 gg.) / M. F. Bolbas. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1966. – 268 s.
2. Polnoe sobranie zakonov Rossijskoj Imperii. Sobr. 2. – T. 40. – Otd. 1. 1865, ot № 41642 – 42509. – SPb. : Tip. 2 otde-niya e.i.v. Kancelyarii, 1867. – 993 s.
3. PSZRI. Sobr. 2. – T.49. – Otd. 1. 1874, ot № 52982 – 53684. – SPb.: Tip. 2 otde-niya e.i.v. Kancelyarii, 1876. – [2], 948 s.
4. Nacyyanal’ny gistarychny arhiў Belarusi (NGAB). – F. 2001. Vop. 1. Spr. 974.
5. NGAB. – F. 2502. Vop. 1. Spr. 108.
6. Pamyatnaya knizhka Vilenskogo general-gubernatora na 1868 g. – SPb., 1868. – 499 s.
7. Pervaya vseobshchaya perepis’ naseleniya Rossijskoj imperii, 1897 g. / pod red. N. A. Trojnickogo. T. IV. Vilenskaya guberniya. – SPb. : Izd. Cent. stat. kom-ta Min. vn. del, 1904. Tetrad’ 3. – HI, 179 s.
8. Pervaya vseobshchaya perepis’ naseleniya Rossijskoj imperii, 1897 g. / pod red. N. A. Trojnickogo. T. V. Vitebskaya guberniya. – SPb. : Izd. Cent. stat. kom-ta Min. vn. del, 1903. Tetrad’ 3. – XIV, 281 s.
9. Pervaya vseobshchaya perepis’ naseleniya Rossijskoj imperii, 1897 g. / pod red. N. A. Trojnickogo. T. XI. Grodnenskaya guberniya. – SPb. : Izd. Cent. stat. kom-ta Min. vn. del, 1904. – XV, 319 s.
10. Pervaya vseobshchaya perepis’ naseleniya Rossijskoj imperii, 1897 g. / pod red. N. A. Trojnickogo. T. XXII. Minskaya guberniya. – SPb. : Izd. Cent. stat. kom-ta Min. vn. del. SPb., 1904. – XVI, 243 s.
11. Pervaya vseobshchaya perepis’ naseleniya Rossijskoj imperii, 1897 g. / pod red. N. A. Trojnickogo. T. XXIII. Mogilevskaya guberniya. – SPb. : Izd. Cent. stat. kom-ta Min. vn. del. SPb., 1903. – XVI, 275 s.
12. NGAB. – F. 2187. Vop. 1. Spr. 32.
13. NGAB. – F. 2502. Vop. 1. Spr. 244.
14. NGAB. – F. 2502. Vop. 1. Spr. 393.
15. NGAB u g. Grodna. – F. 14. Vop. 1. Spr. 655.
16. Prilozhenie k vsepoddanejshemu otchetu Minskogo gubernatora za 1875 g. – Minsk, 1876. – 160 s.
17. *Poletaeva, N. I.* Kupechestvo Belarusi 60-e gg. HIH – nachalo HH v. / N. I. Poletaeva. – Minsk : BGEU, 2004. – 247 s.
18. *Karpievich, V. A.* Razviccyo gandlyu ў Belarusi (1861–1900) : dys. ... kand. gist. navuk: 07.00.02 / V. A. Karpievich ; Belarus. dzyarzh. ped. un-t. – Minsk, 2003. – 138 s.
19. *Subbotin, A. P.* V cherte evrejskoj osedlosti / A. P. Subbotin. – SPb. : Izd. red. Ekonomicheskogo zh-la, 1888. – Vyp. 1. – Minsk, Vil’na, Kovna i ih rajony. – 148 s.
20. *Bolbas, M. F.* Promyshlennost’ Belorussii. 1860–1900 / M. F. Bolbas. – Minsk : Izd-vo BGU, 1978. – 312 s.
21. NGAB. – F. 358. Vop. 1. Spr. 16.
22. NGAB. – F. 124. Vop. 1. Spr. 290.
23. Statistika kratkosrochnogo kredita. Operacii akcionernyh bankov kommercheskogo kredita v 1894–1900 gg. / pod red. A. K. Golubeva. – SPb. : Tip. V. Kirshbauma, 1905. – 435 s.
24. NGAB. – F. 1430. Vop. 7. Spr. 4231.
25. *Bayura, A. N.* Razvitie kreditno-bankovskih uchrezhdenij gubernskogo goroda Grodno v konce XIX – nachale XX vv. / A. N. Bayura // Grodna i grodzency: dzevyac’ stagoddzyaў gistoryi / redkal.: A. I. Antonenka [i insh.]. – Grodna : GrDU, 2008. – S. 193–198.